**Галіна Багданава**

# ПАДАЕ ЗЕРНЕ...

***Н.Маеўская. Дэка... ная пластыка ... радасць стала". ... фаянс, 1996. Кі... Т.Васюк.***



Падае зерне ў мяккую глебу. Толькі тады ёсць надзея на добры ўраджай. Выкладчыкі ведаюць, што з акуратных, уважлівых абітурыентаў, як правіла, атрымліваюцца добрыя студэнты. Але ў Беларускім універсітэце культуры, як мне здаецца, задачу ад самага пачатку ўскладнілі. У гэтую ВНУ рызыкуюць прымаць людзей творчых. І, выхоўваючы іх на традыцыях, даюць магчымасць не толькі засвойваць, але і самавыяўляцца. На сённяшні дзень, папраўдзе, я яшчэ не вызначыла для сябе, у чым жа ўсё ж асноўная задача культработнікаў — перадаваць асновы традыцый ці ствараць умовы для творчасці? Хутчэй за ўсё гэтыя дзве задачы яны мусяць нейкім чынам спалучаць. Але... Але, калі асновы рамяства, спеваў, танцаў можа засвоіць і перадаць кожны больш-менш здольны спецыяліст, стварыць атмасферу творчасці, непаўторную аўру разняволенасці, акрыленасці можа толькі той, хто сам творыць, штодня пераступаючы мяжу агульнапрынятага. Нам яшчэ будзе нагода пагаварыць пра тое, як выхоўваюць у Беларускім універсітэце культуры музыкаў, танцораў, кіраўнікоў драматычных студый, сёння ж завітаем на адну з самых маладых кафедраў — народных рамёстваў.

**Усё пачынаецца з прэм'еры...**

Дакладней, нават не з самой прэм'еры, а з той атмасферы, якая на ёй пануе. Калі загадчык кафедры народных рамёстваў кандыдат мастацтвазнаўства Рыгор Шаура запрасіў мяне на прэм'еру сваёй кнігі "Самадзейнае выяўленчае мастацтва Беларусі", над якою ён працаваў шмат гадоў, я не чакала, што траплю на сапраўднае свята. Калегі падрыхтавалі і выстаўку ягоных ранейшых манаграфій і нават часопісных публікацый, і выдатны канцэрт (вось калі сапраўды адчуваеш, што значыць універсітэт культуры!). А колькі цёплых, шчырых слоў сказалі Рыгору Фёдаравічу і рэктар Беларускага універсітэта культуры Ядвіга Грыгаровіч, і выкладчыкі, і студэнты. І я падумала, што калі б студэнты здолелі засвоіць хоць бы адну народную мудрасць, навучыліся ўспрымаць не толькі чужое гора, але і чужую радасць, як сваю, іх ужо б можна было лічыць культурнымі людзьмі...

— *Шаноўны Рыгор Фёдаравіч, мяне сапраўды ўразіла тое, як натхнёна віталі выхад у свет вашай кнігі. І гэта сведчыць не толькі пра павагу асабіста да вас, але ж, пэўна, і да ўсёй традыцыйнай культуры, якая стала ў Беларускім універсітэце культуры трывалаю глебай для навучання і выхавання. Скажыце, у вас ніколі не ўзнікае непаразуменняў з тымі, хто прыйшоў да вас вучыцца, наконт значэння, каштоўнасці народнага мастацтва?*

— Ды не. Тыя, хто прыйшоў да нас вучыцца, вельмі добра ўсведамляюць і каштоўнасць народнага мастацтва, і яго значэнне ў агульнай духоўнай культуры. Прыйшоў час не толькі збіраць, аналізаваць узоры народнага мастацтва, але і рыхтаваць спецыялістаў, якія б маглі кваліфікавана вырашаць самыя розныя арганізацыйныя і творчыя пытанні далейшага развіцця традыцый. Наш універсітэт першым узяў на сябе такую адказнасць... Вялікую ролю тут адыгрываюць сацыяльна-эканамічныя, палітычныя ўмовы, якія ці спрыяюць, ці адмоўна адбіваюцца на развіцці культуры. Сёння гэтыя ўмовы мы можам лічыць даволі спрыяльнымі...

***Некалькі старонак з жыцця Беларускага універсітэта культуры***



***Н.Катовіч. У рацэ часу. Воўна, 1996. Кіраўнік А.Салохіна.***



***А.Зяневіч. Фрагмент кампазіцыі "Спакуса". Гліна, 1996. Кіраўнік Т.Васюк.***

*Н.Губіна. Батлейка "Мадэль свету". Гліна, 1996. Кіраўнік Т.Васюк.*

*Л.Пахомава. Народны строй. 1996. Кіраўнік М.Марцьянава.*

*В.Салаўёва, М.Траццяк, С.Кошалева, В.Халявіна. Калядныя строі "Бусел", "Мядзведзь", "Каза", "Баба". Саломка, 1996. Кіраўнік Л.Малахава.*







*— Якія віды рамёстваў, на ваш погляд, варта найперш падтрымліваць маладымі кад*

— Мне здаецца, гэта найперш ткацтва, вы ка, лозапляценне, ганчарства, разьба па дрэ

*— Цікава, а якія спецыяльнасці карыстаю вашым універсітэце і на вашай кафедры най шаю папулярнасцю ў абітурыентаў?*

— Ва ўніверсітэце гэта менеджмент у с культуры, народныя рамёствы і сацыяльная гогіка. А калі браць нашую кафедру, гэта ганч ва, саломапляценне, мастацкая апрацоўка др

*— Традыцыі для вашых студэнтаў — а творчасці. А якім чынам яны іх засвойваюц выязджаюць у экспедыцыі, ці сустракаюцца з страмі?*

— Раней, калі была магчымасць, мы выяз ў экспедыцыі на Віцебшчыну. Цяпер, на жаль сродкаў ні на экспедыцыі, ні на пленэры. І з страмі сустракаемся толькі ў Мінску...

*— Застаецца спадзявацца на ініцыятыву студэнтаў і выкладчыкаў...*

— У нас на кафедры працуюць вопытны кладчыкі, члены Саюза мастакоў, народныя стры: Тамара Васюк, Уладзімір Рынкевіч, У мір Масленікаў, Ада Салохіна, Лідзія Мала Аляксандр Новікаў і іншыя. Мы сістэматычна нізуем выстаўкі вучэбных і творчых работ ст таў (гэта нашыя справаздачы), экспануем ра выкладчыкаў.

*— Ведаю, што вы не стрымліваеце творчых парыванняў вашых студэнтаў. І традыцыйнае мастацтва, традыцыйныя тэхнікі набываюць у іхніх працах, нават дыпломных, вельмі сучаснае асэнсаванне...*

— Традыцыйнасць у мастацтве не можа быць застылай. Яна толькі адпраўны пункт у бязмежную і бясконцую творчасць...

На жаль, эканамічнае становішча, у якім апынулася нашая дзяржава, не дае магчымасці планамерна размяркоўваць нашых выпускнікоў. Многія фабрыкі мастацкіх вырабаў спынілі сваю дзейнасць. Вытворчасць, у тым ліку і промыслы, шукаюць, дзе і як зарабіць болей грошай... Ды і самі нашыя выпускнікі не заўсёды едуць туды, куды мы іх накіроўваем. Гэта адна з вельмі вострых нашых праблем. Некаторыя ўладкоўваюцца ў камерцыйныя структуры культуры і мастацтва. Асноўная ж частка выпускнікоў ідзе выкладаць у вучылішчы мастацкадэкаратыўнага профілю, у мастацкія школы, цэнтры эстэтычнага выхавання. Беспрацоўных, здаецца, пакуль што не заставалася.

*— Чым вашыя выпускнікі адрозніваюцца ад выпускнікоў, скажам, Беларускай акадэміі мастацтваў?*

— Тут параўноўваць, пэўна, не варта, бо перад акадэміяй і нашым універсітэтам стаяць розныя задачы. Акадэмія — гэта акадэмічная падрыхтоўка мастакоў. А мы рыхтуем спецыялістаў традыцыйнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Вось пашыраем прафілізацыю “мастацкая апрацоўка дрэва”, адкрываем “лозапляценне”. Нядаўна ўзялі ў арэнду памяшканне Шчомысліцкай школы (10 вялікіх пакояў) і там разгортваемся з новымі профілямі ДПМ.

*— Шаноўны Рыгор Фёдаравіч, самі вы шмат гадоў цікавіліся не толькі традыцыйным народным мастацтвам, але і інсітным жывапісам. Што б вы сказалі пра перспектывы ягонага развіцця на Беларусі?*

— Ёсць шмат людзей з непазбыўнаю, унутранаю патрэбаю нешта ствараць, упрыгожваць сваё жыццё. І гэта, як правіла, заўжды выліваецца ў творчасць, у мастацтва. Так было і так будзе. Іншая справа, ці варта і як кіраваць гэтым працэсам, як стымуляваць, падтрымліваць гэтую адвечную прагу чалавека тварыць... Тут патрэбная цэлая сістэма навукова-метадычных і арганізацыйных структур... Але гэта тэма іншай гаворкі.

*— Вы маглі б назваць сённяшніх вашых студэнтаў сваімі аднадумцамі і паслядоўнікамі?*

— Сярод іх шмат сур'ёзных, зацікаўленых людзей. Мы верым і вельмі спадзяёмся, што яны будуць дастойна працягваць справу нашага жыцця...

Варта дадаць, што кафедра, якой кіруе Рыгор Шаура, вядзе не толькі вочнае, але і завочнае навучанне. Прычым работнікі культуры з усёй Беларусі маюць магчымасць за час сесіі засвоіць асновы практычна ўсіх відаў рамёстваў, навучыцца і ткаць, і ганчарыць, і плесці з саломкі... Хочацца верыць, што свае веды яны гэтаксама апантана, як іхнія універсітэцкія выкладчыкі, будуць перадаваць сваім вучням і гурткоўцам.

А выкладчыкі ў Беларускім універсітэце культуры працуюць сапраўды самаахвярна. І, мяркуючы па дыпломных работах, сёння ўжо можна гаварыць пра своеасаблівыя майстар-класы, ці, калі хочаце, нават творчую школу кожнага з майстроў. Можна разважаць аб правільнасці, плённасці таго ці іншага шляху навучання, аб канцэпцыі, якую прапануе той ці іншы майстар сваім вучням. Але яны ёсць: і шляхі, і канцэпцыі. І студэнты маюць магчымасць выбару. Ёсць школа саломапляцення Лідзіі Малахавай, якая летась сярод іншых паказала, на мой погляд, незвычайна сучасны, сплецены, аздоблены саломкаю ансамбль адзення “Калядоўшчыкі”. Яна ж, Лідзія Малахава, вучыць студэнтаў размалёўцы па дрэву. Ёсць школа габелену Ады Салохінай (летась у яе было найбольш выпускнікоў). Можна гаварыць і пра свае традыцыі ў выхаванні майстроў па тканінах, адзенню. Мы яшчэ абавязкова вернемся да праблем выхавання спецыялістаў па ўсіх гэтых відах рамёстваў. Але сёння, каб даць вам уяўленне пра дыяпазон творчай самарэалізацыі выпускнікоў кафедры народных рамёстваў Беларускага універсітэта культуры, хочацца спыніцца на школе керамікі нашай выдатнай мастачкі Тамары Васюк. З'ява гэтая тым больш унікальная, што вучыць ганчарству, рамяству ўсё ж пераважна мужчынскаму, — жанчына.

**Абарона дыпломных работ на кафедры народных рамёстваў Беларускага універсітэта культуры. 1994.**



### Керамічная сімфонія

Школа — гэта цэласная, навукова-творчая сістэма навучання і выхавання, гэта мастак ці майстра-лідэр і вучні, якія ні ў якім разе не павінны страціць сваёй індывідуальнасці. І няма для настаўніка большага шчасця, як усведамляць, што ён пакінуў пасля сябе не толькі творы, але і вучняў, якія ўжо ў наступным стагоддзі будуць пераасэнсоўваць, ува-



*Н.Лаўрэнцьева. Батлейка. Дрэва, размалёўка, 1996. Кіраўнік Л.Малахава.*

*Л.Хацкевіч. "Зямля мая". Воўна, 1994. Кіраўнік А.Салохіна.*

*А.Сянкевіч. Дэкаратыўныя паўміскі "Калядкі". Гліна, паліва, 1996. Кіраўнік Т.Васюк.*





сабляць рэчаіснасць, будуць пераплаўляць у вобразы хуткаплынны час, будуць мацаваць, будуць крышталізаваць культуру народа.

Гліна прыдатная не толькі для вырабу прыгожых і зручных у карыстанні побытавых рэчаў. У гліне можна ўвасобіць, можна выказаць нават сваю канцэпцыю светабудовы. Пра гэта сведчаць і апошнія работы самой Тамары Васюк, і работы яе вучняў.

У руках Тамары гліна, як і іншыя самыя розныя матэрыялы, якія выкарыстоўвае яна для лепкі, то застываюць дакладнымі скульптурнымі абрысамі твараў, то мякка выгінаюцца, ператвараюцца ў жывую плынь, і ўжо не толькі фактура, але і святло, паветра, цені працуюць на стварэнне шматасацыятыўных, часам лірычных, часам безвыходна-трагічных (згадайце яе чарнобыльскую серыю) вобразаў. Светлая строгая беласць твараў слынных беларускіх жанчын — ці не супрацьвага гэта сённяшняму нашаму бязладдзю?

Гэткую самую супрацьвагу неперадольнай, як часам здаецца, сучаснай дысгармоніі ўбачыла я і

ў работах леташніх выпускнікоў Беларускага універсітэта культуры. Керамісты ўразілі мяне шырынёю і глыбінёю ўвасобленых у, здавалася б, чыста ўжытковым матэрыяле праблем.

Вы толькі ўслухайцеся, як паэтычна назвалі свае дыпломныя працы выпускнікі Арцём Гадалаў і Віталь Рыдзеўскі! Падлогавыя вазы “Світанак на Палессі”, свяцільнікі “Ночка Яна”... І гэтыя назвы цалкам адпавядаюць прасветленаму каларыту архаічных па форме пасудзін і таемна-бліскучых паліваных падсвечнікаў. Упісаліся, нават, я б сказала, уліліся ў інтэр'еры строгае керамічнае пано Святланы Пярскевіч для аддзела рэдкай кнігі бібліятэкі (на ім вельмі далікатна пераасэнсаваныя матывы Скарынавых гравюр) і светла-блакітныя паліваныя дэкаратыўныя паўміскі Алены Сянкевіч з рэльефам на тэмы “Калядкаў” для ўтульнай малой залы універсітэцкай сталовай. Старажытныя беларускія святы Купалле, Каляды не выпадкова сталі лейтматывам многіх і вучэбных, і дыпломных студэнцкіх работ. Культура заўжды пачыналася і пачынаецца з традыцый. І наколькі дакладна, свежа здолее будучы работнік культуры пераасэнсаваць традыцыйную тэму, настолькі, як мне бачыцца, арыгінальным, глыбокім будзе ягоны падыход да сваёй будучай працы, працы па адраджэнню народных рамёстваў. Як зберагчы ўласцівы ўсяму народнаму мастацтву сінкрэтызм і адначасова даць прастору для бязмежнай варыятыўнасці, імправізацыі? Сучасны малады чалавек прагне не толькі дасканала авалодаць тымі ці іншымі прафесійнымі прыёмамі, але і выявіць свой погляд на свет, нават пафіласофстваваць... І ці мае права настаўнік спыняць яго на гэтым шляху?

А цяпер хочацца звярнуцца да работнікаў і кіраўнікоў нашых музеяў, і перш за ўсё да дырэкцыі Нацыянальнага музея гісторыі і культуры. Алена Зяневіч у сваёй дыпломнай кампазіцыі “Спакуса” вылепіла з гліны практычна ўсіх нашых беларускіх нячысцікаў (тут і Лесавік, і Хут, і Чорт, і Лясны нячысцік...). Чаму б не закупіць гэтую сапраўды унікальную калекцыю для музея? Чаму б не запісаць на магнітафон усе легенды, якія Алена расказала пра кожнага з іх на абароне свайго дыплома? Мяне асабіста абражае і непакоіць тое, што нашым дзецям і з экрана тэлевізара, і з вітрынаў кіёскаў літаральна ўбіваюць у галаву чужынскія жахі, чужых монстраў і нячысцікаў. Можа быць, час выхоўваць нашых дзяцей на сваіх героях і антыгероях? Тым больш, як сведчыць Алена, нашыя нячысцікі крыўдзілі толькі кепскіх людзей, а добрым яшчэ й памагалі.

Калі ў рознаўзроўневай аб'ёмнай кампазіцыі з нячысцікаў Алены Зяневіч, якія нечым нагадвалі ідалаў з вострава Пасхі ў мініяцюры, распрацоўваўся паганскі пласт нашай культуры, Наталля Маеўская пераасэнсавала ў гліне-фаянсе светласць і ўзнёсласць, закладзеныя ў Каляды хрысціянствам. “Нова радасць стала”... І благаслаўляюць алегарычных калядоўшчыкаў анёлы, якія быццам даюць ім у рукі божы знак — музычныя інструменты. “Творца — гэта божы пасланнік на нашай зямлі”, — экспрэсіўна, эмацыянальна даводзіла Наталля Маеўская. А Наталля Губіна паказала, што з гліны можна не толькі ляпіць, але і канструяваць. Яна ўклала сваю канцэпцыю Сусвету ў “Батлейку”, дзе і Анёлы-званочкі, і Змей з абпаленымі палкаю страсцю крыламі, і Жанчына, уся ў вечным руху зменлівасці, і больш стабільны Мужчына ўяўляюць сабою вобразы-загадкі, інтэлектуальныя шыфры. Кожны можа мець адвольныя асацыяцыі паводле зададзенай тэмы. Упэўнена: тэатр, які зацікавіцца канструкцыяй (дзеючай канструкцыяй!) Наталлі Губінай, зможа паставіць сапраўды сучасны еўрапейскі спектакль.





*В.Канкаловіч. “Сказ пра Рагнеду”. Воўна, 1994. Кіраўнік А.Салохіна.*

*К.Прымічэнкава. “Прымакі”. Воўна, кераміка, 1995. Кіраўнік А.Салохіна.*

Летась на кафедры народных рамёстваў разам з нашымі студэнтамі вучыўся кераміст з Ірака Самер Балан. Ён прадставіў у якасці дыпломнай работы інтэр'ерную аб'ёмную модульную пластыку “Святло”. І вось што значыць мова мастацтва, мова культуры! Дастаткова было паглядзець на ягоныя літаральна насычаныя паўднёвым, сонечным каларытам шары-свяцільнікі, каб адчуць іншую, нетутэйшую прыроду, іншую традыцыю.

Хочацца пажадаць усім, хто працуе, вучыцца на кафедры народных рамёстваў Беларускага універсітэта культуры, каб народнае мастацтва, фальклор і надалей заставаліся для іх не нейкаю застылай матэрыяй, а жывою стыхіяй, у якой яны здолеюць адшукаць вобразы для пераасэнсавання сённяшняй нашай рэчаіснасці.

Падтрымліваючы традыцыйныя рамёствы, навучаючы людзей сакрэтам майстэрства, яны не могуць наступіць на горла ўласнай песні, знівеляваць сваё творчае “я”. Можа, так яно і павінна быць. Бо толькі творца здольны падтрымаць творцу. М